

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2016 ГОД

Падпіска на выданні ажыццяўляецца на дагаворнай аснове.

## Заказ выданняў:

Заказ на выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адсылайце на e-mail: nbb-izdat@mail.ru; edit@nlb.by або на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*пр. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкама, то дагавор павінен заключацца **паміж Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі і аддзелам культуры выканкама.**

Даведачныя тэлефоны выканаўцаў гл. на с. 14

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.: (+375 17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

Нацыянальная бібліятэка Беларусі
Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл. (+375 17) 293 28 21
Факс (+375 17) 266 37 23

У кіёску Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (за наяўны разлік)
Тэл. (+375 17) 293 28 52

РУП «Акадэмічная кніга»
Пр. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

ААТ «Белкніга»
Вул. Чыгуначная, 27а, 220089, г. Мінск
Тэл./факс: (+375 17) 222 89 45, 222 89 51

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ 10

Каляндарны план выхаду ў свет інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2016 г. 12

# Друкаваныя выданні

## 1. **Бібліятэчны веснік:** зборнік артыкулаў. Вып. 8

*Адказны за выпуск Пшыбытка М.Г.*




Чарговы выпуск навуковага зборніка прысвечаны пытанням фарміравання сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы, перспектывам развіцця бібліятэк. У ім працягваецца публікацыя матэрыялаў па праблемах заканадаўчай базы бібліятэчнай практыкі, фарміравання і захоўвання інфармацыйных рэсурсаў, арганізацыі бібліятэчна-інфармацыйнага і сацыякультурнага абслугоўвання карыстальнікаў, распрацоўкі і ўкаранення сучасных электронных сэрвісаў і тэхналогій. Разглядаюцца вынікі навуковых даследаванняў, пытанні прафесіяналізацыі бібліятэчных кадраў.

Зборнік артыкулаў з’яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі.

Прызначаны спецыялістам у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, выкладчыкам, аспірантам і магістрантам, кіраўнікам сферы культуры.

## 2. **Бібліятэчны свет:** часопіс*

*Галоўны рэдактар Кірухіна Л.Г.*




Часопіс, заснавальнікамі якога з’яўляюцца Нацыянальная бібліятэка Беларусі і Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, выдаецца з мэтай навукова-практычнага і навукова-метадычнага забеспячэння бібліятэчнай справы, а таксама раскрыцця творчага і навуковага патэнцыялу спецыялістаў. Публікуюцца матэрыялы, якія адлюстроўваюць дзяржаўную культурную па-

---

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь» і праз гандлёвыя аб’екты Белсаюздруку. Індэксы выдання – 74895 (інд.), 748952 (вед.).

літыку, стан і перспектывы развіцця бібліятэк розных сістэм і ведамстваў, замежны вопыт.

Выдаецца штогод 6 разоў.

Прадстаўляе інтарэс для тых, хто вывучае бібліятэчную справу, гісторыю, краязнаўства і культуру Беларусі.

## 3. **Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі.** Вып. 19

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




У чарговым выпуску навуковага зборніка працягваецца публікацыя матэрыялаў па праблемах вывучэння, захоўвання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі кніжнай культуры. Зборнік артыкулаў з'яўляецца навуковым выданнем, якое рэцэнзуецца і ўключана ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных, гістарычных навуках і культуралогіі. Матэрыялы зборніка ўводзяць у навуковы ўжытак унікальныя дакументальныя помнікі, новыя дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кнігі і культуры Беларусі, і будуць карыснымі ўсім, хто цікавіцца нашай спадчынай.

## 4. **Инструментарий индексатора и методика его применения в библиотеках Беларуси**

*Ответственный за выпуск Пугачёва С.А.*




В издании отражены методические аспекты смысловой обработки документов в крупнейших библиотеках Беларуси и Национальной книжной палате Беларуси. Обобщен опыт применения международной классификационной системы Универсальная десятичная классификация (УДК), авторитетных записей при формировании поискового образа документа. Предло-

жены также методические решения, принятые в Национальной библиотеке Беларуси по индексированию нетекстовых документов (нотных, аудиовизуальных, картографических изданий и изодокументов).

Предназначается в помощь профессиональной деятельности любых каталогизирующих учреждений, а также системы подготовки, переподготовки и повышения квалификации сотрудников библиотек, музеев, издающих и книготорговых организаций и т.п.

## 5. **Материалы IV Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры»**

*Ответственный за выпуск Есис Н.С.*




Сборник содержит материалы IV Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», который ежегодно проводит Национальная библиотека Беларуси. Публикуются доклады известных специалистов национальных и крупнейших библиотек, научно-исследовательских учреждений, представителей других организаций, научных учреждений Беларуси и зарубежных стран, посвященные актуальным вопросам развития библиотечного дела.

Материалы публикуются в авторской редакции.

## 6. **Матэрыялы XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў**

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




Зборнік складаецца з матэрыялаў XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, якія ў 2016 г. арганізуе Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Уключае даклады па гісторыі беларускай кніжнай культуры.

## 7. Новыя кнігі: па старонках беларускага друку**

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




Штомесячны ўніверсальны бібліяграфічны бюлетэнь інфармуе пра новыя кнігі беларускіх выдавецтваў, найбольш значныя артыкулы з рэспубліканскай перыёдыкі, а таксама рэцэнзіі на беларускія выданні.

У якасці дадаткаў друкуюцца біяграфічныя спісы або агляды, прысвечаныя значным гістарычным падзеям і актуальным пытанням сучаснага развіцця Беларусі, «Беларускі каляндар, … год», а таксама матэрыялы да юбілеяў выдатных дзеячаў краіны, шэрагу арганізацый і ўстаноў, што складаюць аснову эканомікі, культуры, навукі і асветы Беларусі.

Прызначаны ў дапамогу прафесійнай дзейнасці работнікаў бібліятэк, іншых культурных і асветных устаноў, а таксама студэнтам, навучэнцам і ўсім неабыякавым да гісторыі, культуры і сучаснага жыцця сваёй краіны, тым, хто адчувае неабходнасць аператыўна атрымліваць патрэбную інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і арганізацыі вольнага часу.

*Тэмы дадаткаў на 2016 г.:*

№ 1. Даты беларускага календара (сакавік – красавік 2016 г.; 8 дат).

№ 2. Даты беларускага календара (май – чэрвень 2016 г.; 8 дат).

№ 3. Маладзечна – культурная сталіца 2016 г.

№ 4. Героі Вялікай Айчыннай вайны (да 75-годдзя з пачатку Вялікай Айчыннай вайны).

---

** Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты «Газеты и журналы Республики Беларусь» і праз тарговыя аб’екты Белсаюздруку. Індэксы выдання – 74972 (інд.), 749722 (вед.).

№ 5. Даты беларускага календара (ліпень – верасень 2016 г.; 14 дат).

№ 6. Даты беларускага календара (кастрычнік – лістапад 2016 г.; 8 дат).

№ 7. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі.

№ 8. Беларускі каляндар, 2017 год. Частка 1.

№ 9. Беларускі каляндар, 2017 год. Частка 2.

№ 10. Даты беларускага календара (снежань 2016 г.; студзень – люты 2017 г.; 14 дат).

№ 11. Даты сусветнага календара (юбіляры 2017 г.).

№ 12. Дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку».

## 8. **Праз гравюры да слова Скарыны:** камплект паштовак

*Адказны за выпуск Кірэева Г.У.*




Камплект паштовак будзе ўключаць адабраныя з розных кніг Біблії, надрукаваных Францыскам Скарынам, гравюры з подпісамі. На адвароце кожнай паштоўкі змесціцца цытата асветніка з яго прадмовы да дадзенай кнігі. Гравюры ў выданнях Скарыны складаюць даволі падрабязны пераказ зместу кнігі і ілюструюць складаныя для ўспрыняцця біблейскія вобразы. Прадмовы першадрукара набліжаюць змест кнігі да чытача. Як казаў сам асветнік, прадмовы накіраваны на аблягчэнне разумення кнігі. Такім чынам, паштоўкі будуць папулярызаваць кніжнае мастацтва Скарыны і яго слова.

У камплекце 8 паштовак.

## 9. **Электронны інфармацыйны рэсурс нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання**

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




У дапаможніку раскрываюцца асноўныя аб’екты ўліку нацыянальнай бібліяграфіі, крытэрыі выяўлення і адбору нацыянальных і краязнаўчых дакументаў, асаблівасці іх бібліяграфічнай характарыстыкі; даюцца метадычныя рэкамендацыі па пошуку інфармацыі ў зводным ЭІР нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі, па індэксаванні беларусазнаўчых і краязнаўчых дакументаў.

У дадатках прыводзяцца спіс тэрытарыяльных дзяленняў у класіфікацыйных табліцах УДК, якія маюць дачыненне да Беларусі, інфармацыя пра змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды; спіс фізіка-геаграфічных рэгіёнаў краіны.

Выданне прызначана ў дапамогу прафесіяналам бібліятэчнай сферы.

## 10. **Францыск Скарына: гісторыя застыла ў радках:** зборнік сцэнарыяў

*Адказны за выпуск Башкірава Н.У.*




У выданні змешчаны сцэнарныя распрацоўкі, якія дапамогуць супрацоўнікам бібліятэк у падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў для дарослых і дзяцей, прысвечаных 500-годдзю беларускага кгігадрукавання, а таксама жыццю і дзейнасці аднаго з самых яркіх прадстаўнікоў беларускай культуры эпохі Адраджэння – Францыска Скарыны.

# Электронныя выданні

## 11. Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2011–2015)

*Адказны за выпуск Пшыбытка М.Г.*




У выданні ўсебакова аналізуюцца асноўныя кірункі дзейнасці бібліятэк Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у 2011–2015 гг.: арганізацыя бібліятэчнага абслугоўвання, фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк, даведачна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне, стан аўтаматызацыі бібліятэк, навукова-метадычная работа, работа з бібліятэчнымі кадрамі. Аналіз зроблены на падставе маніторынгу дзейнасці абласных універсальных бібліятэк, раённых і гарадскіх бібліятэчных сістэм, дзіцячых бібліятэк на працягу пяцігадовага перыяду.

## 12. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1909–1919)

*Адказны за выпуск Градоўкіна І.У.*




На кампакт-дыску прадстаўлены бібліяграфічная, фактаграфічная, паўнатэкставая інфармацыя пра гісторыю дзейнасці Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, асоб, звязаных з работай установы; лічбавыя копіі выданняў камісіі і публікацый яе супрацоўнікаў; суправаджальныя матэрыялы (навуковыя, даведачныя, ілюстрацыйныя).

Выданне прызначана для навуковых работнікаў, выкладчыкаў, студэнтаў і аспірантаў, краязнаўцаў, бібліятэкараў, супрацоўнікаў музеяў і архіваў, аматараў айчыннай гісторыі.

Падрыхтавана сумесна з кафедрай крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ, Віцебскай абласной бібліятэкай і Віцебскім абласным краязнаўчым музеем ў межах НДР «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі».

## 13. «З верай і праўдай прайшоў праз эпоху...»: да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы (1896–1991)

*Адказны за выпуск Гарбачова Л.В.*




Электроннае выданне прысвечана жыццю і творчай дзейнасці беларускага драматурга, байкапісца, празаіка, мовазнаўца, грамадскага дзеяча Кандрата Крапівы (1896–1991), 120-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца ў 2016 г.

На дыску прадстаўлены бібліяграфічныя і фактаграфічныя матэрыялы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Кандрата Крапівы, а таксама электронная калекцыя выданняў, у тым ліку аўдыявізуальных, выяўленчых і архіўных дакументаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і асабістага архіва ўнучкі пісьменніка А.І. Атраховіч.

Разлічана на шырокае кола карыстальнікаў, якія цікавяцца нацыянальнай літаратурай, гісторыяй і культурай роднага краю.

## КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
## выхаду ў свет інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2016 г.

| № п/п | Выданне | Адказны за выпуск | Выхад у свет |
|---|---|---|---|
| | *ДРУКАВАНЫЯ* | | |
| 1 | Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 8 | Пшыбытка М.Г. | Лістапад |
| 2 | Бібліятэчны свет: часопіс | Кірухіна Л.Г. | 1 раз у 2 месяцы |
| 3 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 19 | Кірэева Г.У. | Верасень |
| 4 | Инструментарий индексатора и методика его применения в библиотеках Беларуси | Пугачова С.А. | Май |
| 5 | Материалы IV Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» | Есіс Н.С. | Кастрычнік |
| 6 | Матэрыялы XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў | Кірэева Г.У. | Красавік |
| 7 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Градоўкіна І.У. | Кожны месяц |
| 8 | Праз гравюры да слова Скарыны: камплект паштовак | Кірэева Г.У. | Люты |
| 9 | Электронны інфармацыйны рэсурс нацыянальнай бібліяграфіі Беларусі: методыка стварэння і выкарыстання | Градоўкіна І.У. | Чэрвень |
| 10 | Францыск Скарына: гісторыя застыла ў радках: зборнік сцэнарыяў | Башкірава Н.У. | Май |

| | | | |
|---|---|---|---|
| *ЭЛЕКТРОННЫЯ* | | | |
| 11 | Агляд дзейнасці бібліятэк сістэмы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2011–2015) | Пшыбытка М.Г. | Снежань |
| 12 | Дакументы і матэрыялы па гісторыі Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (1909–1919) | Градоўкіна І.У. | Лістапад |
| 13 | «З верай і праўдай прайшоў праз эпоху...»: да 120-годдзя з дня нараджэння Кандрата Крапівы (1896–1991) | Гарбачова Л.В. | Сакавік |



# ПОЛИГРАФИЧЕСКИЕ УСЛУГИ НАЦИОНАЛЬНОЙ БИБЛИОТЕКИ БЕЛАРУСИ

**цифровая печать** (изготовление визитных карточек, конвертов, бейджей, меню для ресторанов, дипломов, сертификатов, наклеек, открыток, приглашений, вкладышей для CD/DVD, дисконтных карт, брошюр, буклетов, блокнотов, календарей, книг, закладок, листовок, флаеров, фотоальбомов);

**широкоформатная печать** (изготовление плакатов, постеров, чертежей);

**ризографическая печать**;

**копировальные работы** (черно-белое и полноцветное копирование, широкоформатное копирование) на оборудовании Xerox 6030 (CD-дисков – 300 шт. в сутки);

**создание мультимедийных изданий** (разработка структурного макета, разработка и согласование дизайна страниц, программное проектирование и тестирование, разработка дизайна обложки диска и накатки на диск);

**тиражирование CD/DVD** (запись на CD/DVD, печать на поверхности CD/DVD, ламинирование поверхности CD/DVD) на оборудовании R-Quest TCA 9200, CD/DVD Print Factory 2 RU;

**редакционно-издательская подготовка** любой сложности;

**послепечатные работы** (переплетные работы: твердый переплет, термоклеевой переплет, переплет на скобу, переплет на пружину на оборудовании RENZ SWR 360, Fellowes PB 2650; ламинирование холодное (ширина до 1260 мм) и горячее (до 1670 мм); биговка; перфорация; резка) на оборудовании Ideal 7228, GMP Exelam, INTROMA BP-500;

**плоттерная резка** (Summa S160T, ширина до 1600 мм);

**сувенирная продукция** (нанесение изображения на майку, кепку, кружку).

Издательский отдел Национальной библиотеки Беларуси оснащен новейшей техникой, позволяющей оперативно и качественно выполнять заказы любой сложности: черно-белая цифровая мини-типография Xerox DT6100, полноцветный цифровой комплекс Xerox 8000, широкоформатный принтер Xerox 8160, инженерная система Xerox 6030 и т. д. Специалисты издательского отдела индивидуально подходят к выполнению каждого заказа.

Дополнительную информацию Вы можете получить по тел./факсу (+375 17) 266 37 23, e-mail: edit@nlb.by.

Надеемся видеть Вас в числе наших клиентов!

# ПРАПАНУЕМ НАБЫЦЬ

## ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Библиотеки Беларуси в цифрах и фактах (1991–2011)

Библиографическое описание книжных изданий: практическое пособие

Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 1–7

Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 13–18

Материалы Международных книговедческих чтений (IX–XI)

Материалы Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» (I–III)

Методические рекомендации по нормированию технологических процессов в библиотеке

Методические рекомендации по формированию библиографических записей на альбомы и атласы

Разработка и внедрение виртуальных сервисов: методическое пособие

Современные информационные технологии в библиотечно-информационном обслуживании пользователей с нарушениями зрения

Оформление библиографического списка к научной работе: методические рекомендации

## ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ

Запаветны напеў, запаветная даль… Белавежская пушча

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)

Паэт красы і гармоніі: да 120-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча (1891–1917)

Подпольная и партизанская печать Беларуси. 3-е изд.

Сапегиана: книжное собрание рода Сапег = Сапегіяна: кнігазбор роду Сапегаў

Служыць радзіме..: да 250 годдзя з дня нараджэння Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833)

Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага: да 150-годдзя з дня нараджэння

Спадчына Юзафа Ігнацыя Крашэўскага

100 год з гісторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі: дакументы і матэрыялы. 1840–1940 гг.

ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН
ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ
НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ
на 2016 год

Падпісана да друку 30.12.2015. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$. Лічбавы друк.
Умоўн. друк. арк. 1,16. Ул.-выд. арк. 0,9.
Тыраж 200 экз. Заказ 553.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова «Нацыянальная бібліятэка Беларусі».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/398 ад 02.07.2014.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворца, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/157 ад 02.07.2014.

Пр. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
Тэл. (+375 17) 293 27 68.
Факс (+375 17) 266 37 23.
E-mail: edit@nlb.by